# Гісторыя

*М.М. ХАМЕЦ*

## ПРАБЛЕМА ФУНКЦЫЯНАВАННЯ ПАВЯТОВЫХ СОЙМІКАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XVII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст. НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ І ЯЕ АДЛЮСТРАВАННЕ Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Рассматривается состояние российской, польской, литовской и белорусской историографии проблемы поветовых соймиков в конце XVII – первой половине XVIII в. белорусских земель Великого Княжества Литовского. Отмечается недостаточная разработанность данного вопроса как в белорусской, так и в зарубежной историографии.

The article considers the state of problem of district seimiks in the end of XVII – 1th half XVIII centuries of the Belarus earths of the Grand Duchy of Lithuania in the Russian, Polish, Lithuanian and Belarusian historiography. The insufficient readiness of the given question both in Belarus, and in a foreign historiography is marked.

Інстытут павятовых соймікаў займаў значнае месца ў сістэме дзяржаўнага кіравання Рэчы Паспалітай у XVI–XVIII стст., таму без яго вывучэння цяжка скласці цэласную карціну гісторыі беларускіх зямель канца XVII – першай паловы XVIII ст.

Праблематыка саслоўна-прадстаўнічых органаў у Вялікім Княстве Літоўскім прыцягвае ўвагу даследчыкаў даволі даўно. Вельмі важнымі і фундаментальнымі застаюцца працы расійскіх гісторыкаў канца XIX – пачатку XX ст., але амаль усе аўтары за апошні храналагічны рубеж бралі сярэдзіну ці канец XVI ст., таму дзейнасць соймікаў імі не была ахоплена поўнасцю. Аднак без вывучэння гэтага кола даследаванняў нельга разглядаць праблематыку павятовых соймікаў у канцы XVII – першай палове XVIII ст.

Найбольш грунтоўная праца «Литовско-Русский сейм» аб генезісе парламентарызму ў ВКЛ да Люблінскай уніі 1569 г. належыць М.К. Любаўскаму. На падставе вывучэння шырокага кола крыніц навуковец робіць выснову аб роднасці польскага і літоўскага сойма з заходнееўрапейскімі традыцыямі прадстаўніцтва шляхты ў дзяржаўным кіраванні. Аўтар таксама падрабязна разглядае развіццё соймікаў на землях ВКЛ у кантэксце станаўлення Вальнага сойма. Ён лічыць, што соймавая, судовая і адміністрацыйна-тэрытарыяльныя рэформы 1565–1566 гг. сталі галоўным вынікам соймавага шляхецкага руху пры Жыгімонце Аўгусце, што было замацавана ў Другім Статуце ВКЛ 1566 г. Здзяйсненне шляхецкай «дэмакратыі» праз соймікі і Вальны сойм прывялі ў далейшым Рэч Паспалітую (і ВКЛ як ее частку), па меркаванні аўтара, спачатку да анархіі, а потым і да гібелі[1]. У іншай сваёй працы «Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии» Любаўскі дапаўняе свае назіранні аб узнікненні і развіцці соймікаў у кантэксце сацыяльна-палітычнай эвалюцыі ВКЛ у XIII–XVI стст. і робіць высновы аб тым, што рэформы 1565–1566 гг. былі апошнім этапам унутранай асіміляцыі ВКЛ і Каронай Польскай[2]. У палеміку з М.К. Любаўскім уступіў Н.А. Максімейка. Яго праца «Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 года» выступае ў некаторай ступені як адказ на манаграфію «Литовско-Русский сейм» Любаўскага. У супрацьвагу ён вылучае тэзіс аб тым, што фарміраванне сойма і соймікаў было абумоўлена не столькі намаганнямі шляхты пашырыць свой уплыў на дзяржаўнае кіраванне, сколькі неабходнасцю стварыць эфектыўную сістэму прыняцця рашэнняў ва ўмовах пастаяннай ваеннай пагрозы ў 1560-я гг. з боку Маскоўскага княства і татарскай арды. Соймікавая рэформа дасягае аддзялення соймавых функцый ад ваенных, так як раней сходы шляхты насілі паўваенны характар і не маглі эфектыўна вырашаць разнастайныя праблемы дзяржавы[3]. Іншым значным прадстаўніком ліберальнай расійскай гістарыяграфіі з'яўляецца І.І. Лапо. Яго працы прысвечаны сацыяльна-палітычнай гісторыі ВКЛ у XVI ст. І. Лапо спрабаваў распрацаваць праблемы сацыяльна-палітычнай структуры ВКЛ, дзе ён адзначае: агульнадзяржаўныя сацыяльныя і палітычныя структуры; мясцовыя органы самакіравання і рэгіянальныя асаблівасці шляхты[4]. Аўтар вылучае павятовае соймікаванне як адзін з абавязкаў шляхты, як працу, дастойную сумленнага «грамадзяніна»[5].

Ф.І. Леантовіч таксама ў пачатку XX ст. займаўся распрацоўкай соймікавай праблематыкі ў кантэксце Вальнага сойма. Як і М. Любаўскі, ён лічыць з'яўленне соймікаў у ВКЛ уплывам польскіх парламенцкіх традыцый. Праз яго працы паўсюдна праходзіць канва параўнання працэсаў, што адбываліся ў XI–XVI стст. на заходне- і ўсходнерускіх землях, вылучэнне прычын той розніцы ў дзяржаўным ладзе, якая склалася на працягу стагоддзяў адасобленага існавання. Аўтар робіць цікавыя назіранні наконт паступовасці распаўсюджання соймавых традыцый з Захаду на Усход, дзе яшчэ існавала «вечавое» права. Павятовыя соймікі, на яго погляд, выступалі як інструмент для дасягнення шляхтай сваіх саслоўных інтарэсаў[6].

Менавіта гэтай плеядай гісторыкаў амаль завяршылася вывучэнне ў Расіі праблем саслоўна-прадстаўнічых органаў улады ў ВКЛ. Выключэннем з'яўляецца артыкул маскоўскага гісторыка А.Н. Мальцава, які разглядае інструкцыі павятовым паслам ад літоўскіх і беларускіх зямель на сойм 1657 г.[7] У кантэксце «ўз'яднання» расійскага і беларускага народаў ён даследуе некаторыя соймікавыя пастановы сярэдзіны XVII ст. у сваёй манаграфіі «Россия и Белоруссия в середине XVII века»[8].

У XIX – пачатку XX ст. польская гістарычная навука не надавала вялікай увагі праблеме соймікаў Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XVII – першай палове XVIII ст. Міжваенныя гісторыкі таксама амаль не цікавяцца літоўскімі соймікамі. Выключэнне – даследаванне Ганны Калэнкевічуўны, прысвечанае дзеянню партыі Тызенгаўзаў у соймікавым жыцці ВКЛ XVIII ст.[9]

Пэўнага прагрэсу ў польскай гістарыяграфіі па вывучэнню парламентарызму Вялікага Княства не назіралася да 1970-х гг., калі з'явілася праца Станіслава Кашцялкоўскага, прысвечаная жыццю і дзейнасці Антонія Тызенгаўза. Між іншым тут разглядаецца ўдзел літоўскага падскарбія ў соймікавым жыцці сярэдзіны XVIII ст.[10] З гэтага часу ў Польшчы актыўна пачынаюць цікавіцца праблематыкай павятовых соймікаў ВКЛ як часткі Рэчы Паспалітай. Часцей за ўсё яны разглядаюцца як фрагмент больш вялікіх пытанняў. Напрыклад, дынастыю Сасаў і яе дачыненне да правінцыяльнага палітычнага жыцця вывучала Сафія Зелінскя[11]. У некалькіх артыкулах Х. Віснера былі даследаваны пабудова і дзейнасць павятовых соймікаў ВКЛ Віленскай канвакацыі ў XVII ст.[12] Адзін з іх прысвечаны працы новагародскага сойміка ў XVII ст., дзе яскрава паказаны адносіны часткі літоўскай шляхты да праблем усёй Рэчы Паспалітай[13]. Правілы пабудовы і функцыянавання, у тым ліку і літоўскіх соймікаў, разгледжаны ў манаграфіі С. Плазы «Sejmiki i zjazdy szlacheckie województw poznańskiego i kaliskiego. Ustrój i funkcjonowanie (1572–1632)»[14]. Хенрык Альшэўскі разглядае практыку працы соймаў і павятовых соймікаў у перыяд праўлення дынастыі Сасаў і вывучае грамадска-палітычную думку той эпохі, накіраваную на ўдасканаленне гэтых інстытутаў[15]. Аналізам інструкцый віленскага сойміка ў час панавання Жыгімонта III Вазы займаўся Ян Серэдыка[16]. Увогуле соймікамі шляхецкай Рэчы Паспалітай XVII–XVIII стст. займаўся В. Крэйгзэсэн[17]. Агульную тэарэтычную базу працы павятовых соймікаў у XVI–XVIII стст. для ўсёй Рэчы Паспалітай распрацавалі аўтары выдання «История государства и права Польши» (Ю. Бардах, Б. Леснадарскі, М. Піэтрчак)[18].

Пераломным можна лічыць пачатак XXI ст., калі ў польскай навуцы з'явіліся манаграфіі, прысвечаныя праблематыцы літоўскіх соймікаў. Анджэй Закшэўскі – адзін з нямногіх польскіх навукоўцаў, які амаль цалкам займаецца вывучэннем парламентарызму ў ВКЛ, вынікам чаго стала серыя артыкулаў, прысвечаных прававым падставам, будове і функцыянаванню соймікаў[19]. У 2000 г. выйшла яго фундаментальная манаграфія «Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki». Пры даследаванні соймікаў ВКЛ у XVI–XVIII стст. ён абраў цікавы, але даволі спрэчны метадалагічны падыход. Прыкладам тыповага сойміка ВКЛ для гэтага навукоўца з'явіўся соймік Трокскага павета, абгрунтоўвалася гэта тым, што астатнія былі ці перыферыйнымі (памежныя паветы), ці з асобымі правамі (Жмудскае староства і Полацкае ваяводства і г. д.), ці са «сталічным» статусам (Віленскі соймік). Аўтар указвае на ідэнтычнасць літоўскіх соймікаў з польскімі, але адзначае, што першыя рэгуляваліся пісьмовым правам, а другія абапіраліся ў асноўным на звычаёвае. Яшчэ адной важнай спецыфікай даследчык лічыць вялікую ролю магнатэрыі ў дзейнасці соймікаў, што не было так выразна бачна ў Кароне. А. Закшэўскі не разглядае асобна канец XVII – першую палову XVIII ст., але прасочвае працэс развіцця ад з'яўлення соймікаў да знікнення Рэчы Паспалітай[20].

Польскі гісторык Анджэй Рахуба ў сваёй працы «Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай 1569–1763 гг.» таксама не бачыць карэнных адрозненняў у парламенцкай структуры ВКЛ пры пэўным захаванні тэндэнцый на аўтанамізм ліцьвінамі. Літоўская шляхта, як і польская, разглядала соймікі як адзіны сродак на выказванне сваёй думкі па хвалюючых яе пытаннях і інструмент уздзеяння на дзяржаву. Таксама ён выказвае думку аб тым, што ўплыў соймікаў на ўнутрыпалітычнае і эканамічнае жыццё ўзрастаў, аб чым сведчыць пашырэнне іх функцый. Як і А. Закшэўскі, ён разглядае соймікі ВКЛ у працэсе развіцця ад сярэдзіны XVI ст., але за верхнюю хрcraналагічную мяжу бярэ 1763 г., тлумачачы гэта пачаткам у Рэчы Паспалітай пасля смерці Аўгуста III вострага палітычнага крызісу і рэформ, накіраваных на выхад з яго[21]. А. Рахубу належыць карысны артыкул, прысвечаны месцам

правядзення пасяджэнняў павятовых соймікаў у ВКЛ[22].

Літоўскія гісторыкі часоў незалежнасці ў 1920–1930-я гг. праблемай соймікаў не займаліся. Як выключэнне можна назваць некалькі прац. Аўгустас Янулаіціс у сваёй кнізе аб Вялікім Літоўскім Трыбунале ў XVI–XVIII стст. разглядае дзейнасць толькі «грамнічных» соймікаў, якія абіралі дэпутатаў у гэтую структуру[23]. Канстанцінас Авіжоніс у працы «Bajoras valstybiniame Lietuvos gyvenime Vazų laikais» даследуе шляхту часоў кіравання дынастыі Вазаў. Даследаванне тычыцца структуры ўлады, адносін шляхты і манарха, заканадаўства, вырашэння ўнутраных і знешніх праблем дзяржавы[24]. Адолфас Шапока, даследуючы Люблінскую унію, закранае праблему соймікавання ў ВКЛ і яе дачынення да дамоў паміж палякамі і ліцьвінамі[25]. Савецкі час таксама не быў вельмі плённым для літоўскіх гісторыкаў.

На сучасным этапе ў Літве праблематыкай парламентарызму ВКЛ у канцы XVII – першай палове XVIII ст. займаюцца некалькі гісторыкаў. М. Ючас выдаў артыкулы, прысвечаныя Літоўскаму сойму і літоўскаму парламентарызму XVIII ст.[26] Дзейнасцю віленскага сойміка ў XVIII ст. займаецца Р. Юргайціс, таксама адзін з артыкулаў ён прысвяціў дэпутацкаму сойміку Рэчыцкага павета 1706 г.[27] Жмудскаму сойміку 10 лістапада 1693 г. прысвяціў свой артыкул Гінтаўтас Слесарыўнас[28]. Ковенскім соймікам у пачатку XVIII ст. займаецца Робертас Кальвінскас[29].

Да сённяшняга часу ў беларускай гістарычнай навуцы няма грунтоўных прац, якія былі б прысвечаны павятовым соймікам у канцы XVII – першай палове XVIII ст. Пры гэтым было б карысна вылучыць некалькі даследчыкаў, якія ўздымалі ў сваіх працах і артыкулах праблему соймікавання шляхты беларускіх паветаў ВКЛ.

Найбольш значна з даваенных беларускіх гісторыкаў інстытут павятовых соймікаў закранаў М.В. Доўнар-Запольскі. Яго праца «Гісторыя Беларусі» так і не ўбачыла свет, але была выдадзена па рукапісах у сярэдзіне 1990-х гг. Даследчык дае кароткі агляд развіцця павятовых соймікаў на беларускіх землях ВКЛ і характарызуе іх як органы, абмяркоўваючыя грамадскія пытанні, і як орган мясцовага самакіравання. М.В. Доўнар-Запольскі робіць выснову аб тым, што абмежаванне ўдзелу ў сойме і сойміках іншых саслоў'яў, акрамя шляхты, не дазволіла ім паўнавартасна развівацца[30].

У беларускай гістарычнай навуцы, як і ў літоўскай, у 1950–1980-я гг. не праводзілася даследаванне павятовых соймікаў. Толькі з 1990-х гг. пачынаецца значная актывізацыя. Зараз гэту праблематыку разглядае А.А. Радаман. Ён прасочвае ў асноўным дзейнасць соймікаў на захадзе і цэнтры беларускіх зямель ВКЛ у канцы XVI – пачатку XVII ст. (Мінскі, Навагародскі і іншыя паветы). Асноўную ўвагу ў сваіх даследаваннях навуковец робіць на гісторыка-прававы кампанент[31]. У манаграфіі П.А. Лойкі «Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст.» закранаецца ўдзел беларускай шляхты ў сойміках і соймах[32]. Агульную характарыстыку соймікам на беларускіх землях у XVI – пачатку XVII ст. дае ў сваім артыкуле П.А. Лойка, разглядаючы асноўныя іх віды, функцыі, склад і пытанні, якія яны вырашалі[33].

Часткова праблему станаўлення і развіцця парламентарызму разглядае У.А. Падалінскі ў кантэксце рэпрэзентацыі ліцьвінаў на соймах РП у апошняй трэці XVI ст. Ён вывучыў працу перадсоймавых і рэляцыйных соймікаў гэтага перыяду, а таксама дзейнасць Генеральнага сойміка ВКЛ у Ваўкавыску[34].

Серыя прац была прысвечана барацьбе магнацкіх груповак на беларускіх землях (Г.В. Прыбытка, А.У. Мацук і Д.В. Віцько). Гэтыя навукоўцы вывучалі стаўленне шляхты да ўнутранага і знешняга стану краіны часткова праз даследаванне дзейнасці павятовых соймікаў. Даволі падрабязна вывучана палітычная барацьба магнатэрыі на ўзроўні шляхецкіх соймікаў у XVII–XVIII ст.[35]

З праведзенага аналізу гістарыяграфіі XIX – пачатку XXI ст. яскрава бачна, што праблема павятовых соймікаў Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст. даволі грунтоўна разглядалася ў дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі. Сучасная польская гістарыяграфія, нягледзячы на некалькі прац, якія закранаюць увесь перыяд існавання соймікаў у ВКЛ, не вывучае асобна перыяд канца XVII – першай паловы XVIII ст. Беларуская і літоўская гістарычная навука разглядае гэта пытанне даволі фрагментарна ці ў кантэксце іншых гістарычных з'яў і падзей. Адсутнасць у айчыннай гістарычнай навуцы спецыяльных прац аб павятовых сойміках у канцы XVII – першай палове XVIII ст. указвае на неабходнасць самастойнага іх вывучэння. На сённяшні дзень мы можам меркаваць аб саслоўна-прадстаўнічых інстытутах XVI–XVIII ст. на беларускіх землях толькі на падставе поглядаў расійскіх гісторыкаў канца XIX – пачатку XX ст. і сучасных польскіх навукоўцаў. Апошнія карыстаюцца сваімі пазіцыямі на супольную гісторыю беларускага і польскага народаў у межах адзінай гістарычнай прасторы Рэчы Паспалітай.

[1] Гл.: Любавский М.К. Литовско-Русский сейм. Опыт по истории в связи с внутренним строем и внешнею жизнью государства. М., 1901.

[2] Гл.: Любавский М.К. Очерки истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. СПб., 2004.

[3] Гл.: Максимейко Н.А. Сеймы Литовско-Русского государства до Люблинской унии 1569 года. Харьков, 1902.

[4] Гл.: Лаппо И.И. Великое Княжество Литовское во второй половине XVI столетия: литовско-русский повет и его сеймик. Юрьев, 1911.

[5] Гл.: Лаппо И.И. Великое Княжество Литовское за время от заключения Люблинской унии до смерти Стефана

Батория (1569–1586). Опыт исследования общественного и политического строя. СПб., 1901. Т. 1.

[6] Гл.: Леонтович Ф.И. К истории административного строя Литовского государства. Варшава, 1899.

[7] Гл.: Мальцев А.Н. Наказы белорусских и литовских шляхецких сеймиков 1657 г. // Проблемы общественно-политической истории России и славянских стран: Сб. ст. к 70-летию академика М.Н. Тихомирова. М., 1963.

[8] Гл.: Мальцев А.Н. Россия и Белоруссия в середине XVII века. М., 1974.

[9] Гл.: Kalenkiewiczówna A. Rozkład partii Tyzenhauza na tle sejmików litewskich // Księga pamiątkowa Koła historyków – słuchaczy USB. Wilno, 1933. S. 121–155.

[10] Гл.: Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz, podskarbi nadworny litewski. Londyn, 1970–1971. T. I–II.

[11] Гл.: Zielińska Z. Mechanizm sejmikowy i klientela radziwiłłowska za Sasów // Przegląd Historyczny. 1971. T. LXII. Z. 3. S. 398–416.

[12] Гл.: Wisner H. Konwokacia Wileńska. Z dziejów parlamentaryzmu litewskiego czasach Zymunta III // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1968. T. XX. Z. 2. S. 75–80; Idem. Naprawa państwa w uchwałach sejmików Wielkiego Księstwa Litewskiego w pierwszej połowe XVII w. // Studia polsko-litewsko-białoruskie / Pod red. J. Tomaszewskiego, E. Smułkowej i H. Majeckiego. Warszawa, 1988. S. 37–50; Idem. Sejmiki litewskie w czasach Zygmunta III i Władysława IV. Konwokacja wileńska oraz sejmiki przedsejmowe i relacyjne // Miscellanea Historico-Archivistica. 1989. T. III. S. 51–66.

[13] Гл.: Wisner H. Przedsejmowy sejmik nowogródski w latach 1607–1648 // Przegląd Historyczny. 1978. T. LXIX. Z. 4. S. 677–693.

[14] Гл.: Płaza S. Sejmiki i zjazdy szlacheckie województw poznańskiego i kaliskiego. Ustrój i funkcjonowanie (1572–1632) // Zaszyty Naukowe Uniwersytetu Jagiellońskiego, Nr. I 720, Prace Prawnicze, z. 110. Warszawa, 1984. S. 13–75.

[15] Гл.: Olszewski H. O skutecznym rad sposobie. Kraków, 1989; Idem. Praktyka limitowania sejmików // Czasopismo Prawno-Historyczne. 1961. T. XIII. Z. 1. S. 33–55.

[16] Гл.: Seredyka J. Instrukcje powiatu wileńskiego na sejmy panowania Zygmunta III Wazy // Śląski Kwartalnik Historyczny Sobótka, R, XLVIII. 1993. Nr. 2-3. S. 189–197.

[17] Гл.: Kriegseisen W. Sejmiki Rzeczypospolitej szlacheckiej w XVII–XVIII wieku. Warszawa, 1996.

[18] Гл.: Бардах Ю., Леснодарский Б., Пиетрчак М. История государства и права Польши. М., 1980.

[19] Гл.: Zakrzewski A.B. Marszałek powiatowy Wielkiego Księstwa Litewskiego marszałkem sejmikowym (XVI–XVIII w.) // Parlament, prawo, ludzie. Studia ofiarowane Profesorowi Juliuszowi Bardachowi w sześćdziesięciolecie pracy twórczej. Warszawa, 1996. S. 356–361; Idem. Ograniczenie przez sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego monarszego prawa mianowania urzędników sądowych, XVII–XVIII w. // Lietuvos valstybe XII–XVIII a. Vilnius, 1997. S. 173–184; Idem. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego (połowa XVI – koniec XVIII w.) // Palamentaryzm w Polsce we współeczesnej. Warszawa, 1995. S. 100–106; Idem. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego epoki stanisławowskiej (do 1788 r.). Zmiany w ustroju i funkcjonowaniu // Ziemie Północne Rzeczypospolitej Polsko-Litewskiej w dobie rozbiorowej 1772–1815: Materiały z konferencji międzynarodowej odbytej w dniach 11–14 maja 1995 r. w. Warszawa; Toruń, 1996. S. 56–66; Idem. Król wobec sejmików i zjazdów Wielkiego Księstwa Litewskiego (XVI–XVIII wiek) // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск – Наваградак, 23–24 лістап. 2007 г. Мн., 2008. С. 96–109.

[20] Гл.: Zakrzewski A.B. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII w. Ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki. Warszawa, 2000.

[21] Гл.: Рахуба А. Вялікае Княства Літоўскае ў парламенцкай сістэме Рэчы Паспалітай 1569–1763 гг. / Пер. з польскай М. Раманоўскага. Мн., 2008.

[22] Гл.: Rachuba A. Miejsca obrad sejmików Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1569–1794 // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск – Наваградак, 23–24 лістап. 2007 г. Мн., 2008. С. 183–197.

[23] Гл.: Janulaitis A. Vyriausiasis Lietuvos Tribunalos XVI–XVIII amź. Jo atsivadimas veikima ir reikšme Lietuvos gyvenime. Kaunas, 1927.

[24] Гл.: Avižonis K. Bajoras valstybiniame Lietuvos gyvenime Vazų laikais. Kaunas, 1940.

[25] Гл.: Šapoka A. Lietuva ir Lenkija po 1569 metu Liublino. Kaunas, 1938.

[26] Гл.: Jučas M. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystes parlamentarizmas // Lietuvos seimas. Vilnius, 1996. S. 76–112; Idem. Parlamentarzym litewski w XVIII wieku // Społecyeństwo obywatelskie i jego reprezentacje (1493–1993). Warszawa, 1995. S. 115–124.

[27] Гл.: Jurgaitis R. Vilniaus miesto problemos Vilniaus seimelyje XVIII a. // Lietuvos Aukštųjų Mokyklų Mokslo Darbai. Istorija. XXXVIII. 1998. S. 26–33; Юргайтис Р. Как голосовала шляхта на сеймике Речицкого повета 7 февраля 1706 г., выбирая депутатов Главного Литовского Трибунала // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск – Наваградак, 23–24 лістап. 2007 г. Мн., 2008. С. 285–295.

[28] Гл.: Sliesoriūnas G. Iš Žemaitijos seimelių istorija: 1693 m. lapkričio 10 d. Žemaitijos seimelis // Žemaičių praeitis. VIII. 1998. S. 32.

[29] Гл.: Kalvinskas R. Kauno pavieto seimelio viekla Šiaures karo metu // Mūsų praeitis. V. 1997. S. 29–37.

[30] Гл.: Доўнар-Запольскі М.В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.

[31] Гл.: Радаман А.А. Кіраванне соймікавымі паседжаннямі ў Вялікім Княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім у другой палове XVI – пачатку XVII ст. // Весці БДПУ. Сер. 2. 1999. № 2 (32). С. 285–295; Ён жа. Элекцыйныя соймікі Навагародскага павета ў другой палове XVI ст. // Гісторыя Беларусі: новае ў даследаванні і выкладанні. Мн., 1999. Ч. 2. С. 109–115; Ён жа. Шляхецкія соймікі і з'езды як структурная адзінка ўлады ў Менскім павеце ў другой палове XVI ст. // Магдэбургскае права на Беларусі. Мн., 1999. С. 79–87.

[32] Гл.: Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мн., 2002.

[33] Гл.: Лойка П.А. Соймікі беларускіх зямель у дзяржаўна-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай (апошняя трэць XVI – першая трэць XVII ст.) // Парламенцкія структуры ўлады ў сістэме дзяржаўнага кіравання Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XV–XVIII стагоддзях: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск – Наваградак, 23–24 лістап. 2007 г. Мн., 2008. С. 176–182.

[34] Гл.: Падалінскі У.А. Прадстаўніцтва і палітычная пазіцыя Вялікага Княства Літоўскага на вальных соймах Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI ст.: Дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 2004.

[35] Гл.: Прыбытка Г.В. Барацьба магнацкіх груповак у Вялікім Княстве Літоўскім у сярэдзіне XVII ст. (1655–1668 гг.): Дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 2000; Мацук А.У. Барацьба магнацкіх груповак на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага за палітычнае вяршанства (1717–1763 гг.): Дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 2005; Віцько Д.В. Міжусобная барацьба магнацкіх груповак у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XVII – пачатку XVIII ст.: Дыс. ... канд. гіст. навук. Мн., 2007.

Паступіў у рэдакцыю 20.09.10.

***Максім Міхайлавіч Хамец*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Ю.Л. Казакоў.